ISSN 1024-5928 (print)
УДК 316.343.652

Паступіў у рэдакцыю 13.06.2017
Received 13.06.2017

**К. І. Стаселька**

*Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ АСОБА Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ

**Аннотация**. Анализируются социальная роль и значение интеллектуала. В частности, рассматривается отличие интеллектуала от интеллигента, в том числе социальное. Показана социальная история возникновения категории «интеллектуал» в рамках европейской и отечественной традиции. Анализируется категория «интеллектуал» в понимании представителей европейской науки. Выделяются характеристики и социальные функции интеллектуала, а также интеллектуалов как социальной группы, после чего выводится схема мобилизации общества интеллектуалом. Автор приходит к выводу, что в социальном пространстве интеллектуал является тем социальным агентом, который решает или пытается справиться с общественно значимыми проблемами, с которыми другие социальные агенты или институции не способны справиться, в частности, в силу отсутствия достаточного символического капитала либо по иным причинам, например, связанным с вопросами политического характера (борьбой за власть или её реализацией). Именно интеллектуал благодаря своему особому социальному положению способен выявлять и актуализировать те или иные социальные проблемы и конфликты и именно он благодаря наличию необходимых ресурсов, в частности символического капитала, способен претендовать на решение этих проблем посредством социальной мобилизации.

**Ключевые слова:** интеллектуал, интеллигент, легитимность, публичное пространство, функция, мобилизация, поле

**Для цитирования**: Стаселька, К. І. Інтэлектуальная асоба ў сучаснай сацыяльнай прасторы / К. І. Стаселька // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 4. – С. 23–32.

**K. I. Staselko**

*Institute of Sociology, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## AN INTELLECTUAL IN CONTEMPORARY SOCIAL SPACE

**Abstract.** The author analyzes an intellectual's social role and significance. In particular, he addresses the difference, including social difference, between intellectuals and intelligentsia. The author shows the social history of how the category 'intellectual' emerged within both European and Russian/Belarusian traditions. The article analyzes the category of intellectual as it is viewed by representatives of European science. Then the author identifies the characteristics and social functions of an intellectual and of intellectuals as a social group. After that, he displays a scheme of mobilizing a society by an intellectual. The author concludes that an intellectual is a kind of social agent in a social space who solves or attempts to cope with those socially significant problems which other social agents or institutions are unable to cope with, in particular, due to the lack of sufficient symbolic capital or for other reasons related to issues of political nature (struggle for power or its implementation). It is the intellectual who, due to his special social status, is capable to reveal certain social problems and conflicts and make them relevant, and it is the intellectual who, due to his having necessary resources, in particular, his symbolic capital, is capable to have pretensions to solving these problems through social mobilization.

**Keywords:** intellectual, intelligentsia, legitimacy, public space, function, mobilization, field

**For citation:** Staselko K. I. An Intellectual in Contemporary Social Space. *Vestsi Natsyianal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian series,* 2017, no 4, pp. 23–32 (in Belarusian).

**Гістарычны кантэкст з'яўлення інтэлектуала.** Дыскусіі аб інтэлектуалахаднаўляюцца з некаторай перыядычнасцю як у акадэмічнай супольнасці, так і на больш шырокім узроўні. Пераважна прадметам падобных дыскусій выступае пытанне аб ролі і месцы інтэлектуала ў сацыяльнай і, перш за ўсё, палітычнай прасторы, а іх аднаўленне, як правіла, адбываецца ў кантэксце тых ці іншых актуальных падзей лакальнага альбо міжнароднага характару. Часта немагчымасць прыйсці да кансэнсусу па гэтым пытанні звязана з размытасцю самога паняцця «інтэлектуал» і цяжкасцямі ў размежаванні яго з іншымі падобнымі катэгорыямі. Таму перш чым закрануць пытанне аб месцы інтэлектуала ў сацыяльнай прасторы, варта зразумець сутнасць гэтай катэгорыі. Для ўяўлення ролі і месца інтэлектуала ў сацыяльна-палітычных працэсах і фармулёўкі адэкватнага азначэння дадзенага паняцця неабходна разгледзець прычыны і месца, кажучы дакладней, сацыяльна-гістарычны кантэкст узнікнення не толькі паняцця, але самой асобы, якую называюць інтэлектуал.

© Стаселька К. І., 2017

Паміж даследчыкамі няма згоды адносна перыяду з'яўлення інтэлектуалаў. Так, напрыклад, Жак Ле Гоф адносіць час іх з'яўлення да сярэдневякоўя. Некаторыя даследчыкі называюць ранейшы перыяд з розніцай у некалькі стагоддзяў, а ў некаторых выпадках – тысячагоддзяў. Але можна з упэўненасцю адзначыць, што фігура інтэлектуала, як яна разумеецца сёння, з'яўляецца толькі ў канцы XIX стагоддзя ў сувязі са «Справай Дрэйфуса». Яна з'яўляецца знакавай падзеяй у гісторыі «інтэлектуалаў», а таксама Еўропы ў цэлым, таму варта разгледзець яе падрабязней, каб зразумець той вялікі ўплыў, які яна зрабіла на грамадства і з'яўленне фігуры інтэлектуала.

Так, у 1894 г. па справе ў шпіянажы абвінавачваўся капітан Альфрэд Дрэйфус. Судовы працэс адбываўся у закрытым фармаце. У сувязі з недастатковай колькасцю доказаў суддзі вагаліся пры вынясенні абвінаваўчага вердыкту. Таму з дазволу вайсковага міністра следчы падрабіў дакумент, які мог бы даказаць вінаватасць Дрэйфуса, а менавіта ліст германскага амбасадара, у якім пацвярджаўся факт шпіянажу Дрэйфуса на карысць Германіі. У выніку капітан Альфрэд Дрэйфус быў прысуджаны за шпіянаж і здраду айчыне да ссылкі яго ў Каену. Але ў хуткім часе ўзнікла меркаванне аб тым, што вынесены прысуд з'явіўся вынікам судовай памылкі. Так, нават была апублікавана невялікая кніга пад назвай «Судовая памылка». Яе аўтар спрабаваў даказаць невінаватасць Дрэйфуса. Меркаванне аб яго невінаватасці пачало пашырацца. Нават новы начальнік разведвальнага бюро, Жорж Пікар, выказаў сумненні наконт яго вінаватасці. Затым быў апублікаваны тэкст Эміля Заля «Я абвінавачваю». Справа Дрэйфуса атрымала публічны рэзананс. Усё грамадства Францыі падзялілася на дзве часткі: тых, хто яго падтрымліваў і патрабаваў яго апраўдання, і тых, хто быў супраць яго апраўдання і выступаў у абарону існуючай улады, якая і вынесла прысуд. Першых называлі – дрэйфусары, другіх – антыдрэйфусары. Але размова ішла не столькі пра канкрэтную судовую справу, колькі пра тую пазіцыю, якая панавала ў дачыненні ўлады і таго рэжыму, які ўсталяваўся. Так, чыноўнікі, міністры, генералы, вайсковыя чыны, клірыкі, нацыяналісты, антысеміты (Дрэйфус быў яўрэйскага паходжання) пераважна выступалі супраць Дрэйфуса. У той жа час левыя палітычныя сілы, сацыялісты, радыкалы выступалі ў падтрымку Дрэйфуса. Гэтая справа прывяла да вострых унутрыструктурных супярэчнасцей як у буйных інстытуцых, партыях, акадэмічных кафедрах і таму падобных, так і на мікраўзроўні, у сем'ях, паміж сябрамі, знаёмымі. Прыналежнасць членаў адной групы да таго ці іншага боку выклікала вострыя ўнутраныя, а таксама міжгрупавыя канфлікты. Павысілася грамадская актыўнасць, якая ў асноўным канцэнтравалася вакол гэтай справы. Рабіліся палітычныя акцыі, збіраліся подпісы, ствараліся адмысловыя арганізацыі. Актыўнась была дастаткова высокая як з боку дрэйфусараў, так і з боку антыдрэйфусараў. Пазней высветлілася, што дакументы, на падставе якіх быў асуджаны Дрэйфус, былі сфальсіфікаваны. У 1899 г. адбыўся паўторны суд, так званы Рэйнскі працэс. У вынніку гэтага працэсу ён быў таксама асуджаны, але атрымаў меншае пакаранне. А пазней быў памілаваны прэзідэнтам Лубэ. Але прыхільнікі Дрэйфуса выступілі за тое, каб давесці справу да канца. Так, у 1906 г. было праведзена дадатковае расследаванне, па выніках якога капітан Альфрэд Дрэйфус быў прызнаны невінаватым і апраўданы, ён нават атрымаў ордэн Ганаровага легіёна [10].

Менавіта з гэтымі падзеямі звязана ўзнікненне фігуры інтэлектуала. Можна адзначыць, што слова «intellectuel» у функцыі назоўніка не ўжывалася ў французскай мове да канца XIX стагоддзя, калі казаць дакладней, то да 1890-х гг. Пазней, пасля таго, як яго пачалі ўжываць такім чынам у 90-х гг. XIX стагоддзя, «intellectuel» пісалі курсівам або з вялікай літары. Гэта рабілася для таго, каб паказаць яго асаблівы характар, або тое, што гэта слова абазначае выдатных дзеячаў, пэўную асаблівую катэгорыю людзей. Спосаб напісання гэтага слова сведчыў, што як яно само, так і тыя, каго яно абазначае, выбіваліся з агульных нормаў і змагаліся за асаблівы сэнс. У хуткім часе гэтае слова набыло шырокае выкарыстанне і стала агульнапрынятым таксама дзякуючы таму, што Эміль Заля, у сувязі са «Справай Дрэйфуса», апублікаваў у газеце «L'Aurore» свой знакаміты ліст пад назвай «Адкрыты ліст Прэзідэнту Рэспублікі» (ён увайшоў у гісторыю пад назвай «Я абвінавачваю»). Адразу на наступны дзень пасля публікацыі гэтага ліста была апублікавана калектыўная петыцыя, якую, у знак адабрэння тэксту Заля і патрабуючы перагледзець рашэнне па справе капітана Дрэйфуса, падпісалі

ўніверсітэцкія прафесары, студэнты, журналісты, літаратары, людзі мастацтва і многія іншыя. Тэрмін «інтэлектуал» увайшоў ва ўжытак пасля таго, як адзін з антыдрэйфусараў – Марыс Барэс – у сваім артыкуле назваў гэтую петыцыю «Пратэст інтэлектуалаў». Такім чынам, у гэтым можна бачыць цікавую асаблівасць. Першапачаткова найменне «інтэлектуал» мела абразлівы характар. Французскі сацыёлаг Шарль Крыстаф піша: «Сказаць у 1898 годзе: “гэтыя людзі – інтэлектуалы” – тое самае, што сказаць: “гэтыя людзі – дрэйфусары”, “гэтых людзей, што патрабуюць такіх рэчаў, адхіляе вялікая большасць французаў”» [10, с. 293–294]. Тут ужо змяшчаецца і ідэя іншадумства, і ідэя захопу ўлады. Гэты імпліцытны змест надае вельмі спецыфічную афарбоўку слову «інтэлектуал».

Лагічна можа ўзнікаць пытанне, чаму з’яўленне «інтэлектуалаў» звязваюць менавіта з гэтымі падзеямі, паколькі і да «Справы Дрэйфуса» можна назіраць шэраг выпадкаў, калі фігуры, валодаючыя вялікім сімвалічным капіталам і якіх можна было б назваць інтэлектуаламі, адыгрывалі вялікую ролю на палітычным полі. Так, да прыкладу, А. Ламарцін, В. Гюго, Ф. Шатабрыян, І. Тэн, Ж. Санд і многія іншыя выступалі з дастаткова значнымі палітычнымі дэкларацыямі ў тых ці іншых сацыяльна-палітычных дыскусіях. Так, Эміль Заля быў не першым і не адзіным. Гэта звязана з тым, што менавіта падчас «Справы Дрэйфуса» сацыяльныя агенты, якіх можна назваць інтэлектуаламі (значную частку дрэйфусараў, як было адзначана вышэй, складалі журналісты, універсітэцкія выкладчыкі, студэнты, мастакі, пісьменнікі), змаглі заявіць пра сябе як пра групу, якая асаблівым чынам вылучаецца сярод іншых груп. Гэта не група, якая складаецца з агентаў, што проста займаюцца інтэлектуальнай працай, гэта не група, што прадстаўляе журналістаў, мастакоў і іншых. Прадстаўнікі розных сацыяльных груп аб’ядноўваюцца, але фарміруюць абсалютна новую асаблівую групу на падставе той асаблівай дзейнасці, асаблівай пазіцыі, якую яны займаюць. Такім чынам, інтэлектуалы з’яўляюцца тады, калі яны здольны заявіць пра сябе як пра асаблівую групу [8; 10].

Адносна тых падзей, падчас якіх інтэлектуалы з’явіліся як група, Крыстоф Шарль адзначае наступнае: «Дрэйфусары былі вымушаны прыбягаць у сваёй барацьбе да такой зброі, як свядомы скандал, г. зн. сродкаў, якія парушаюць дапусцімыя нормы. Напрыклад, сцвярджэнне Заля ў яго лісце «Я абвінавачваю» грунтавалася проста на разумовых рэканструкцыях, зыходзячых з некалькіх ускосных улік. Такога кшталту сцвярджэнні траплялі пад катэгорыю дэфамацыі, тым больш, што Заля нападаў на вышэйшых службовых асоб дзяржавы і некаторых кіраўнікоў войску. Другі спосаб самасцвярджэння «інтэлектуалаў» выявіўся ў вышэйзгаданым лісце пратэсту, які з’явіўся для інтэлектуалаў накшталт пасведчання аб нараджэнні. Гэты ліст мусіў паказаць, што Заля не вар’ят: бо пра чалавека, які выказвае супраць іншых такія катэгарычныя абвінавачванні без усялякіх доказаў, заўжды можна сказаць, што ён вар’ят. Але не, Заля не вар’ят, паколькі за яго спіной стаяць прадстаўнікі славеснасці, прадстаўнікі прыродазнаўчых навук, а таксама члены Французскай акадэміі – Анатоль Франс, члены інстытута, прафесары Сарбоны – разумныя людзі, што займаюць ганаровае становішча ў грамадстве. Пасведчанне аб нараджэнні інтэлектуалаў грунтуецца перш за ўсё на калектыўнасці іх самасцвярджэння» [10, с. 294–295]. Гэта таксама звязана з тым, што каб адыгрываць пэўную ролю ў сацыяльна-палітычных працэсах дэмакратычнага грамадства, варта заявіць пра сябе як пра палітычную групоўку або партыю. Менавіта гэта спрабуюць рабіць інтэлектуалы, калі пачынаюць падпісваць і збіраць подпісы пад палітычнымі петыцыямі, калектыўнымі заявамі, што ў далейшым дае магчымасць ствараць аб’яднанні і рабіць крокі ў кірунку доўгатэрміновай дзейнасці. Сваімі выступленнямі інтэлектуалы паказваюць, што прафесійныя палітыкі не здольны цалкам спраўляцца з ускладзенымі на іх абавязкамі. Сваёю дзейнасцю інтэлектуалы прарываюцца ў сферу палітычнага, уплываюць на ход падзей, чым ставяць пад пытанне легітымнасць прафесійных палітыкаў. Але можа ўзнікнуць пытанне, чаму гэтая група пачала фарміравацца менавіта ў сувязі са «Справай Дрэйфуса». Справа ў тым, што пытанне інтэлектуалаў з’яўляецца не проста пытаннем палітычнай пазіцыі, але таксама пытаннем каштоўнасцей. Менавіта таму гэта справа мела такое вялікае значэнне, бо яна закранула каштоўнаснае ядро, на якім базіравалася ў гэты перыяд французскае грамадства і якое мела шмат супярэчнасцей у сувязі з мінулымі рэвалюцыйнымі падзеямі. «Справа Дрэйфуса» сутыкнула прыхільнікаў правоў чалавека, тых, хто ставіць чалавека, яго свабоду і правы вышэй за дзяржаву,

з прыхільнікамі манархізму, якія ставяць дзяржаву вышэй асобнага чалавека. Такім чынам, сутыкнуліся дзве каштоўнасныя каардынаты. Так, першапачаткова слова «інтэлектуал» мела характар абразы і хутка ператварылася ў саманазву, далей слова «інтэлектуал» перастала абазначаць толькі групу дрэйфусараў, а пачало тычыцца асаблівай палітычнай групы, супольнасці, якая «набірала» сваіх людзей сярод тых, хто займаецца разумовай працай. Варта адзначыць, што непасрэдна пасля «Справы Дрэйфуса» пачалі ўзнікаць дыскусіі, у якіх выказваліся меркаванні адносна «канца інтэлектуалаў» і нават «здрады інтэлектуалаў». Такія меркаванні ўзнікалі ў сувязі з тым, што некаторыя прадстаўнікі лагера дрэйфусараў пасля перамогі пачалі здраджваць тым прынцыпам і ідэалам, якія яны адстойвалі раней і якіх не прытрымліваліся пасля дасягнення ўлады. Так, напрыклад, дрэйфусар Ж. Клемансо, што быў рэдактарам газеты і апублікаваў «Я абвінавачваю» Э. Заля, стаўшы прэм'ер-міністрам, кідае за краты лідараў ВКТ – галоўнага прадстаўніка французскага прафсаюза, прыказвае страляць па працоўных, гвалтоўна падаўляе рух лангедокскіх вінаробаў [1; 8].

**Дыскусіі пра інтэлектуалаў.** Адзначым, што «інтэлектуалы» як група не знікае. У розныя перыяды часу, у сувязі з тымі ці іншымі падзеямі, іх роля то змяншаецца, то павышаецца. Так, у перыяд Першай сусветнай вайны пацыфісцкія пазіцыі, якія падзялялі інтэлектуалы, былі не вельмі папулярнымі сярод шырокіх колаў, што ў некаторай меры тлумачылася выбухам патрыятызму. Але ў апошні перыяд вайны, калі ахвяры і іх маштаб былі відавочныя, антывайсковыя пазіцыі пачынаюць набываць моц. У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі фігура інтэлектуала пачынае праяўляцца больш выразна. Гэты перыяд характарызуецца чатырма аспектамі. *Першы аспект* звязаны з папярэдняй крытыкай інтэлектуалаў, абвінавачваннямі ў элітызме, якія пазіцыянавалі сябе як асаблівую групу. З аднаго боку, элітарнасць групы інтэлектуалаў тлумачыцца невялікай колькасцю тых, каго магчыма «рэкрутаваць». Так, напрыклад, у Францыі да 1900 г. налічвалася 30 000 студэнтаў, да 1935 г. іх было ўжо каля 80 000. Прыналежыць у гэтыя часы да студэнцтва ўжо азначала прыналежнасць да элітарнай групы. Невялікая колькасць налічвалася і сярод прадстаўнікоў інтэлектуальных прафесій. З другога боку, у выніку падпісання петыцый, у прыватнасці, інтэлектуалы пазіцыянаваліся як альтэрнатыва грамадскай думкі і кіруючай эліты. У сувязі з большай адукаванасцю і выкананнем сацыяльных функцый бралася надзвычайная адказнасць за тое, што адбываецца ў грамадстве. Але такая пазіцыя супярэчыла як уласна іх прынцыпам, так і прынцыпам дэмакратыі, бо сведчыла аб прывілеяванасці пэўнай групы. У выніку інтэлектуалы пераконваюцца ў набходнасці рэалізацыі дэмакратыі на практыцы, што магчыма з дапамогай асветніцтва і пашырэння адукацыі. *Другі аспект* звязаны з пытаннем партыйнай ангажаванасці інтэлектуала. Пачынаючы з 1920-х гг. і канчаючы 1960-мі гг. адбываліся вострыя спрэчкі адносна таго, ці можа інтэлектуал уступаць у палітычныя партыі, ці можа мець месца партыйны інтэлектуал. Так, у гэтай спрэчцы адна частка сцвярджала, што інтэлектуал мусіць быць партыйна неангажаваным. Другая частка адстойвала пазіцыю, адпаведна якой інтэлектуал – такі ж грамадзянін, як і іншыя, і да таго ж адзіная магчымасць эфектыўнай дзейнасці магчыма толькі пры ўступленні ў партыю. *Трэці аспект* звязаны са з'яўленнем новых сродкаў масавай інфармацыі. У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі пачынаюць актыўна развівацца радыё, а таксама кінематограф. Калі да газет і часопісаў доступ мелі многія інтэлектуалы, то да новых СМІ – значна меншая колькасць. Толькі самыя вядомыя і прызнаныя сярод інтэлектуалаў маглі выказваць сваю пазіцыю праз гэтыя медыя. У выніку адбываецца падзел, які ў далейшым усё больш павялічваецца, на «сапраўдных» інтэлектуалаў, якія валодалі вялікім сімвалічным капіталам і мабілізуючым патэнцыялам і маглі скарыстаць СМІ для пашырэння сваіх ідэй, і тых, хто не меў шырокага доступу да сродкаў масавай інфармацыі, дзейнасць якіх здзяйснялася пераважна ў невялікіх гуртках. У якасці *чацвёртага аспекту* можна назваць унутрыгрупавыя дыскусіі, дзякуючы якім адбываецца мабілізацыя інтэлектуалаў. На павестку дня выносяцца тыя ці іншыя тэмы, што мае немалаважнае значэнне, бо інтэлектуалы мелі вялікі ўплыў на грамадскую думку. Але з пачаткам Другой сусветнай вайны спрэчкі сярод інтэлектуалаў пераходзяць у фармат фізічнага знішчэння, калі правыя інтэлектуалы ўзвышаюцца, а левыя церпяць з боку вішыстаў. Затым сітуацыя змяняецца, і пасля вайны церпяць ужо правыя інтэлектуалы. Адны былі прысуджаны да смяротнага пакарання, другія – да турэмнага

зняволення, іншыя апынуліся ў маргінальным стане. Пасляваенны перыяд многімі аўтарамі называецца «залатым часам інтэлектуалаў», або «эпохай Сартра». Гэта звязана з тым, што пасля вайны ўзвышацца пачалі левыя інтэлектуалы, найбуйнейшай фігурай сярод якіх быў Жан-Поль Сартр. Яго папулярнасць была звязана з шматпрофільнасцю. Сартр быў інтэлектуалам-універсалам. Ён з’яўляецца вельмі папулярным пісьменнікам і ў той жа час прафесійным філосафам, чый аўтарытэт легітымізуецца яго пазіцыяй у акадэмічнай сферы, пацвярджаецца навуковымі ступенямі. Сартр піша раманы, навуковыя працы, артыкулы для газет і часопісаў, піша для тэатра і кіно, з’яўляецца рэдактарам часопіса, выступае па радыё. Гэта чалавек, які дазволіў сабе адмовіцца ад Нобелеўскай прэміі. Дадзеная пазіцыя, такі сацыяльны і сімвалічны капітал былі асабліва моцнымі з-за адсутнасці канкурэтаў сярод правых інтэлектуалаў. Такая сітуацыя прыводзіць да таго, што група левых інтэлектуалаў радыкалізуецца, даходзячы нават да патрабаванняў рэвалюцыі, а таксама дыферэнцыруецца на больш дробныя групоўкі, што адбываецца бадай да алжырскага крызісу [1; 4].

З канца 1970-х гг. зноў пачынаецца крызіс, калі ўзнікае пытанне: ці можа пры такіх умовах існаваць інтэлектуал? Калі так, то кім ён з’яўляецца цяпер? У першую чаргу гэты крызіс звязаны з усё больш актыўным развіццём новых сродкаў масавай інфармацыі. Тэлебачанне і радыё ўсё больш выцясняюць друкаваныя выданні, якія былі для інтэлектуалаў сродкам мабілізацыі грамадзянскай дыскусіі і месцам дэбатаў саміх інтэлектуалаў. Толькі невялікая колькасць інтэлектуалаў маюць доступ да новых медыя, але гэта хутчэй сродак павелічэння сімвалічнага капіталу таго або іншага агента. Месца каштоўнасных канфліктаў, якія былі ў падмурку сацыяльнай ролі інтэлектуалаў ад «Справы Дрэйфуса» на працягу амаль стагоддзя, у гэтых медыя змяншаецца. Зноў узнікае пытанне: што значыць быць інтэлектуалам? Гэтае пытанне паўстае асабліва востра ў сувязі з масавізацыяй вышэйшай адукацыі. Такім чынам, узнікае пэўны парадокс: з аднаго боку, колькасць людзей з вышэйшай адукацыяй, з дыпломам імгненна павялічваецца, а з другога – група інтэлекталаў элітарызуецца, як ніколі дагэтуль, бо кола тых, хто здольны мабілізаваць грамадскую дыскусію, уплываць на грамадскую думку, змяншаецца да невялікай групы сацыяльных агентаў. Узнікае пытанне аб легітымнасці, а менавіта: каго прадстаўляюць і ад імя каго выступае гэтая невялікая група інтэлектуалаў? Яшчэ адна праблема звязана з крызісам саміх грамадскіх спрэчак, грамадскіх дыскусій. Шарль Крыстоф піша: «Па іх меркаванні (інтэлектуалаў), сама па сабе ангажаванасць выклікае вычварнасць ідэалаў: так, Пегі выкрываў у свой час перараджэнне містыкі ў палітыку. Але калі інтэлектуал абмяжоўваецца бяскрыўднымі і «кансэнсуальнымі» мэтамі, ці не адракаецца ён тым самым ад прынцыпаў дысідэнцтва, без якіх было спачатку неймаверным існаванне самога паняцця “інтэлектуал”? Дзеля агітацыі на карысць грамадскапрызнаных мэт лепш падыходзяць зоркі шоу-бізнесу запатэнтаваных інтэлектуалаў» [10, с. 315]. Узнікае пытанне, ці можа сёння ўвогуле існаваць канфлікт між каштоўнаснымі сістэмамі, ці магчыма выйсці па-за рамкі кансэнсусу па агульных пытаннях.

Але змяншэнне ролі інтэлектуалаў у грамадстве ў 1980-х гг. было з’явай не канчатковай, што паказалі падзеі 1990-х гг. і новае іх ўзвышэнне. З развіццём новых медыя, што тычыцца ўжо не тэлебачання і радыё, а інтэрнэту, узнікаюць новыя магчымасці для інтэлектуалаў, таксама адбываецца кардынальная трансфармацыя самой публічнай прасторы. У Францыі дагэтуль вялікі інтарэс да тэмы інтэлектуалаў, што праяўляецца не толькі на ўзроўні публічных дыскусій, але на даследчыцкім узроўні. Так, існуе шэраг даследчых структур, якія займаюцца дадзенай тэмай.

Хоць гісторыя ўзнікнення фігуры інтэлектуала непасрэдна звязана з Францыяй, але на працягу XX стагоддзя такая група, як інтэлектуалы, пачала фарміравацца і актыўна развівацца ў іншых краінах Еўропы, а таксама на іншых кантынентах. Так, дастаткова моцнымі былі гэтыя групы (акрамя Францыі) у Германіі, Італіі, Чэхіі, Польшчы, ЗША, краінах Лацінскай Амерыкі і іншых. Даволі часта інтэлектуалаў падзяляюць на левых і правых адпаведна палітычнай пазіцыі. Можна адзначыць, што сярод самых вядомых інтэлектуалаў пераважнае месца займаюць левыя. Так, напрыклад, такія фігуры, як Жан-Поль Сартр, Андрэ Брэтон, Мішэль Фуко, Гі Дэбор, Ален Бад’ю і іншыя можна аднесці да левых інтэлектуалаў, многія з якіх з’яўляліся членамі французскай камуністычнай партыі (але пры гэтым не з’яўляліся прафесійнымі палітыкамі).

Да левых інтэлектуалаў можна таксама аднесці германскага навукоўца і інтэлектуала Юргена Хабермаса, італьянца Антоніа Негры, амерыканцаў Майкла Хардта і Наома Хомскага, славенца Славога Жыжыка, балгара Жэле Жэлефа і многіх іншых. Калі ў перыяд узнікнення інтэлектуалаў як групы кола праблем, на якія яны звярталі ўвагу, як правіла, абмяжоўвалася рамкамі краіны, у якой яны жывуць, то далей, з развіццём гэтай групы, у гэтае кола пачынаюць уваходзіць праблемы міжнароднага значэння. Такая асаблівасць яскрава праяўляецца сёння, напрыклад, калі разглядаць тэмы тэкстаў, дыскусій, каментарыяў, якія даюць сучасныя інтэлектуалы.

**Катэгорыя «інтэлектуал».** Калі звярнуцца да пытання аб разуменні катэгорыі «інтэлектуал», то нярэдка нават у навуковым дыскурсе да інтэлектуалаў адносяць навукоўцаў, пісьменнікаў, журналістаў, філосафаў і прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп, якія прафесійна займаюцца разумовай працай, што выклікае блытаніну ў размежаванні паміж інтэлектуаламі і, напрыклад, інтэлігенцыяй, культурнай элітай альбо інтэлектуальнай элітай. Але калі разгледзець сацыяльныя функцыі гэтых, на першы погляд ідэнтычных сацыяльных груп, магчымасць іх размежавання ўяўляецца больш відавочнай. Так, Жан-Поль Сартр у сваім тэксце «Абарончая прамова на карысць інтэлектуала» адзначае, што звычайнага навукоўца нельга назваць інтэлектуалам. Інтэлектуалам нельга назваць, напрыклад, вучонага, які працуе над атамнай бомбай, таму што гэта толькі навуковец і не больш за тое. Але ў выпадку, калі навуковец, пераканаными ў магчымасці небяспечных наступстваў выкарыстання атамнай бомбы, пачынае, напрыклад, пісаць маніфест, збіраць подпісы з мэтай папярэдзіць ці перашкодзіць прымяненню атамнай бомбы, то ў гэтым выпадку ён становіцца інтэлектуалам, бо выходзіць за рамкі сваёй кампетэнцыі як вучонага, які канструюе бомбу, і пачынае асуджаць яе прымяненне з іншых (не тэхнічных) пазіцый. Іншымі словамі, у дадзеным прыкладзе вучоны крытыкуе бомбу не за яе тэхнічныя хібы або тэхнічную недасканаласць, але ў абарону чалавечага жыцця, якое ў большасці сістэм каштоўнасцей з'яўляецца вышэйшай каштоўнасцю. Такім чынам, навуковец пачынае закранаць сферу каштоўнасцей, якая не ўваходзіць у сферу яго прафесійнай кампетэнцыі як навукоўца [6]. Сартр адзначае: «Саслоўе інтэлектуалаў – гэта людзі, якія сталі вядомымі, дзякуючы сваім навуковым працам (у галіне дакладных навук, прыкладных навук, медыцыны, літаратуры і г. д.), і цяпер злоўжываюць гэтай вядомасцю для таго, каб выйсці па-за межы сваёй сферы і крытыкаваць грамадства і існуючую ўладу ад імя глабальнай і дагматычнай канцэпцыі чалавека» [6]. Кажучы аб агентах, якія займаюцца разумовай працай, Сартр заяўляе аб тым, што яны знаходзяцца ў складанай сітуацыі. Дзяржава, кіруючыя класы – найбольш актыўныя спажыўцы або эксплуатататары гэтай групы – робяць яе падмуркам сваёй гегемоніі. Гэта значыць перад пераважнай доляй інтэлігенцыі ўзнікае два шляхі (калі наогул пра гэта задумваюцца): або працаваць на карысць кіруючага класа, прыняць дамінуючую ідэалогію і пры гэтым прыняць існуючы стан канфлікту і несправядлівасці, паставіць універсальнае на службу прыватнаму, а разам з гэтым кантраляваць сябе, стаць апалітычным, або пайсці на рызыку аспрэчваць пануючую ідэалогію і перастаць быць агентам пануючай групы [6; 11].

У Мішэля Фуко, які таксама ў якасці прыкладу прыводзіць фізіка-атамшчыка і пагрозу атамнай бомбы, такое азначэнне больш характэрна для інтэлектуала-спецыяліста. Фуко падзяляе, хутчэй па часовай прыкмеце, «інтэлектуала-ўніверсала» і «інтэлектуала-спецыяліста». Ён дае наступныя тры прыкметы, якія адрозніваюць інтэлектуала: асаблівы класавы стан, асаблівыя ўмовы жыцця і працы, а таксама асаблівая палітычная роля. Так, інтэлектуал-універсал быў пераважна пісьменнікам, вольным суб'ектам, які супрацьпастаўляў сябе толькі спецыялісту, які служыў дзяржаве або капіталу. Універсальны інтэлектуал быў усеагульным сумленнем, ён выступаў у якасці настаўніка праўды і справядлівасці і прэтэндаваў на тое, што яго павінны слухаць, як таго, хто прадстаўляе ўсеагульнае. У той час, як інтэлектуал-універсал у большай ступені з'яўляецца ганаровым заканадаўцам, носьбітам усеагульных каштоўнасцей і значэнняў, інтэлектуал-спецыяліст узнікае з фігуры навуковага знаўцы пасля Другой сусветнай вайны [8]. Менавіта тады, на думку Фуко, інтэлектуал пакутуе ад палітычных праследаванняў не з-за агульных разваг, але з-за канкрэтных ведаў, носбітам якіх з'яўляецца інтэлектуал-спецыяліст. Менавіта на гэтым узроўні ён пачынае прадстаўляць палітычную небяспеку. «Калі ўніверсальны інтэлектуал браў на сябе ролю рупара ўніверсальных ісцін, свядомасці ўсіх, то пазней роля

інтэлектуала ўжо не ў тым, каб гаварыць астатнім што трэба рабіць, не ў тым, каб фарміраваць палітычную волю іншых, але ў выкрыцці таго, што здаецца звыклым і відавочным, у прыватнасці, выкрываць уладу там, дзе яна найменш прыкметная і відавочная», – адзначае Фуко [8, с. 205]. Адным з крытэрыяў аднясення сацыяльнага агента да інтэлектуалу, згодна з Фуко, з'яўляецца здольнасць абстрагавацца, адмовіцца ад санкцыянаваных у дадзенай культуры матрыц, ад склаўшыхся ўстойлівых стэрэатыпаў мыслення.

Агент, які займаецца разумовай працай, іншымі словамі, прадстаўнік інтэлігенцыі, не задаецца пытаннем пра сэнс дзейнасці, якую ён выконвае, аб яе месцы, значэнні ў глабальным кантэксце, аб суаднясенні яе з іншымі сферамі дзейнасці. Спецыяліст, які разумее сваю функцыю, мэты, якія перад ім пастаўлены, дзейнічае адпаведна гэтаму, не выходзячы за межы сваёй кампетэнцыі. Як чалавек, як грамадзянін спецыяліст можа расстаўляць пэўныя прыярытэты, рабіць выбар, але як навуковец, прафесіянал ён устрымліваецца ад пытанняў, умоўна кажучы, пра дабро і зло, што і адрознівае яго ад інтэлектуала, які імкнецца, спрабуе выйсці за рамкі ўласнай прафесійнай кампетэнцыі. Інтэлектуал спрабуе знайсці сувязі паміж полем сваёй дзейнасці і іншымі сферамі чалавечага быцця. І гэта, як сцвярджае Пол Баран, па сутнасці адна з функцый інтэлектуала. Напрыклад, палітыку, эканоміку, навуку, літаратуру і іншыя галіны грамадскага жыцця магчыма зразумець толькі ў тым выпадку, калі разглядаць іх як агульныя часткі глабальнай сістэмы. Інтэлектуал, па сваёй пазіцыі, з'яўляецца бунтаром і перашкодай кіруючым колам. Пол Баран дае наступнае азначэнне «інтэлектуала»: «гэта сацыяльны крытык па сваёй сутнасці, чалавек, чый абавязак вызначаць, аналізаваць і такім чынам дапамагаць у пераадоленні перашкод, якія замінаюць у прасоўванні да лепшага, больш гуманнага і рацыянальнага грамадскага парадку» [1].

**Функцыі і характарыстыкі інтэлектуала.** Такім чынам, ужо выявіліся некалькі асаблівасцей, якія адрозніваюць інтэлектуала. Па-першае, акрамя таго, што ён, як і прадстаўнікі інтэлігенцыі, прафесійна займаецца разумовай працай, выходзіць па-за рамкі, па-за межы кампетэнцыі, якая яму вызначаецца, пачынае крытычна ўспрымаць і задаваць пытанні, уключаныя ў больш шырокі кантэкст, чым патрабуе сфера яго прафесійнай дзейнасці. Па-другое, выходзячы за рамкі прафесійнай кампетэнцыі, якія патрабуюць эфектыўнасці і пакідаюць па-за межамі аксіялагічныя аспекты, інтэлектуал закранае каштоўнасныя пытанні, якія, у значнай ступені, і з'яўляюцца падставай яго крытыкі і канфрантацыі з сістэмай, у якую ён непасрэдна ўключаны. Па-трэцяе, ён урываецца ў сферу палітычнага. Нягледзячы на тое, што крытыка ў значнай меры тычыцца кіруючай групы, ён таксама закранае інтарэсы і апазіцыйнай групы, бо не займае нічый бок, знаходзячыся як паміж адной, так і паміж другой групай. Сваімі выступленнямі і маніфестацыямі інтэлектуал сведчыць аб тым, што прафесійныя палітыкі не здольны цалкам спраўляцца з ускладзенымі на іх абавязкамі. Сваёй дзейнасцю інтэлектуал прарываецца ў сферу палітычнага, уплывае на ход падзей, чым ставіць пад пытанне легітымнасць прафесійных палітыкаў. Інтэлектуал прарываецца ў поле палітыкі, але пры гэтым не становіцца – ды і не ставіць сабе за мэту – прафесійным палітыкам. Сярод пазіцый, што варта зафіксаваць, якія характэрны для інтэлектуала, можна назваць наступныя: прафесійная дзейнасць у сферы разумовай працы; стварэнне новага інтэлектуальнага прадукту, прызначанага для публічнай сферы; выхад за рамкі прафесійнай кампетэнцыі; функцыя крытычнасці; палітычная ангажаванасць; ініцыяванне і стымуляванне публічнай дыскусіі/абмеркавання.

Першая характарыстыка, а менавіта прафесійная разумовая праца як крыніца заробку, уласціва як інтэлектуалам і інтэлігенцыі, так і інтэлектуальнай і культурнай эліце. Як адзначалася раней, інтэлектуала адрознівае выхад за межы поля прафесійнай дзейнасці і, перш за ўсё, кампетэнцыі. Але ў дадзеным выпадку ўзнікае лагічнае пытанне: ці ўсе, хто займаецца разумовай працай, абавязкова ствараюць новы інтэлектуальны прадукт? Можна адзначыць, што не ўсе прадстаўнікі інтэлігенцыі ствараюць новы прадукт. Калі вынікам працы пісьменніка ці вучонага з'яўляецца новы інтэлектуальны прадукт, то, напрыклад, вынікі працы галоўнага ўрача бальніцы маюць іншую форму, тое ж тычыцца афіцыйнай інтэлектуальнай эліты. Што тычыцца інтэлектуала, то адназначна гэта так: ён стварае інтэлектуальны прадукт нават у тым выпадку, калі адпаведна прафесійнай дзейнасці ён менеджар, работнік банка або кіраўнік ніжэйшага

ўзроўню. Новым інтэлектуальным прадуктам, як мінімум, у самым сціплым выпадку, становіцца канцэпцыя, вынік крытыкі інтэлектуала, бо тое, што кажа (выступленні, дыскусіі ці заявы) інтэлектуал, пераважна і з'яўляецца новым інтэлектуальным прадуктам. З гэтым жа звязаны наступны аспект. У той час, калі вынікі разумовай працы, напрыклад, вучонага як прадстаўніка інтэлігенцыі прызначаны для пэўнага кола, якім з'яўляецца акадэмічная супольнасць, г. зн. існуюць у полі прафесійнай дзейнасці, то інтэлектуальны прадукт навукоўца як інтэлектуала прызначаны для публікі і існуе не ў полі прафесійнай дзейнасці для спецыялістаў, але ў сферы публічнасці і для кожнага, паколькі ў гэтым заключаецца адна з функцый інтэлектуала, які спрыяе фарміраванню публічнай прасторы, стымулюе грамадскі дыялог. Такім чынам, выкананне інтэлектуалам сваёй ролі немагчыма па-за межамі публічнай прасторы. Таму пазіцыя інтэлектуалаў як групы ў той ці іншай сацыяльнй прасторы ў значнай ступені залежыць ад магчымасці доступу да каналаў масавай інфармацыі і камунікацыі, ад стану публічнай прасторы і ступені сфарміраванасці, актыўнасці грамадзянскай супольнасці.

Інтэлектуалы як група могуць існаваць у грамадстве, дзе існуюць нейкія дэмакратычныя інстытуцыі, дзе ёсць пэўны ўзровень дэмакратыі, нават не вельмі высокі. Гэта звязана з двума аспектамі. Першы – гэта неабходнасць наяўнасці незалежных ад кіруючай групы сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі, што дазваляе інтэлектуалу выказваць сваю пазіцыю і рабіць свой інтэлектуальны прадукт публічным. Другі аспект звязаны з магчымасцю для інтэлектуала быць фінансава незалежным, што магчыма ў выпадку існавання права на прыватную ўласнасць, існавання недзяржаўных (у тым ліку камерцыйных) структур рознага кшталту, г. зн. магчымасць для інтэлектуала атрымліваць свой заробак не ад дзяржавы, што пазбаўляе магчымасці «ціснуць» на яго па месцы працы фінансава. У іншым выпадку магчыма з'яўленне не інтэлектуалаў, але дысідэнтаў, як гэта было ў Савецкім Саюзе. Але варта адзначыць, што са з'яўленнем інтэрнэту вастрыня як аднаго, так і другога аспекту кардынальна зніжаецца, пра што сведчыць у некаторай ступені прыклад камуністычнага Кітая.

Напэўна найбольшай асаблівасцю інтэлектуала з'яўляецца тое, што ён палітычна ангажаваны. Маецца на ўвазе ангажаванасць менавіта палітычная, а не ідэалагічная. Інтэлектуал, не з'яўляючыся прафесійным палітыкам, урываецца ў палітычнае поле і наўпрост ці ўскосна ўплывае на яго. Сама яго дзейнасць, заявы, выступленні закранаюць палітычнае поле, праблемы, звязаныя з уладай, яе выкрыццём. Інтэлектуалам, напрыклад, не з'яўляецца агент, які выступае ад імя партыі, бо такім чынам гэта хутчэй партыйны ідэолаг. Само словазлучэнне «партыйны інтэлектуал» з'яўляецца па сваёй сутнасці слушным, бо крытыка інтэлектуала накіравана на выкрыццё ўлады ў любой яе форме, незалежна ад таго, якой з'яўляецца ўлада – кіруючай ці апазіцыйнай. Адпаведна не можа інтэлектуал прадстаўляць кіруючую групу, паколькі такім чынам становяцца немагчымымі тыя функцыі, якія робяць інтэлектуала інтэлектуалам, што і адбывалася з некаторымі дрэйфусарамі, якія пазней змаглі дасягнуць дзяржаўнай улады. Менавіта з гэтым былі звязаны меркаванні аб «знікненні інтэлектуалаў», а таксама аб «здрадзе інтэлектуалаў». У сваю чаргу інтэлігенцыя, а таксама афіцыйная эліта можа, як у многіх выпадках і адбываецца, прадстаўляць кіруючую групу, выступаць ад імя ўлады. Так, Мішэль Фуко адносна сувязі інтэлектуала і палітычнага поля адзначае наступнае: «...для інтэлектуала занятак палітыкай быў традыцыйна абумоўлены двума рэчамі: станам інтэлектуала ў буржуазным грамадстве, у сістэме капіталістычнай вытворчасці, у ідэалогіі, якую яно выпрацоўвае або навязвае; і яго ўласным дыскурсам у той ступені, у якой ён адкрываў пэўную ісціну, знаходзіў палітычныя адносіны там, дзе іх не заўважалі. Гэтыя два віды палітызацыі не былі чужыя адзін аднаму, але яны не абавязкова супадалі» [9]. Такім чынам, выяўляецца яшчэ адна асаблівая характарыстыка інтэлектуалаў, а менавіта крытычнасць. Крытычнасць, здольнасць рабіць невідавочнае відавочным з'яўляецца адной з асноўных, калі не цэнтральных функцый інтэлектуала. Менавіта з ёй звязаны выхад па-за рамкі, уваходжанне ў іншыя сферы, на што не здольны ні інтэлігенцыя, ні афіцыйная эліта. Але не столькі крытыка сама па сабе, колькі крытыка ў публічнай прасторы, якая стымулюе публічную дыскусію, і спрыяе пэўным зменам.

Такім чынам, вызначыць, ці з'яўляецца той або іншы сацыяльны агент інтэлектуалам, немагчыма выключна на падставе фармальных паказчыкаў, якія дзейнічаюць у выпадку

інтэлігенцыі. Немагчыма гэта вызначыць, зыходзячы толькі з прафесійнай дзейнасці, усё залежыць ад канкрэтнага выпадку, ад той пазіцыі, якую займае сацыяльны агент. Так, напрыклад, сам па сабе журналіст займаецца разумовай дзейнасцю, стварае новы інтэлектуальны прадукт, які можа быць прызначаны для публічнай сферы, закранае поле палітыкі, але ён не з'яўляецца інтэлектуалам, пакуль яго дзейнасць замыкаецца выключна ў межах уласнай працы журналіста, пакуль ён выконвае ролю выключна журналіста і звяртаецца толькі да аўдыторыі, абмежаванай аўдыторыяй дадзенага СМІ, але ён становіцца інтэлектуалам у выпадку выхаду за гэтыя рамкі.

**Мабілізуючая функцыя інтэлектуала.** Кажучы аб ролі і месцы інтэлектуала ў сацыяльнай прасторы, неабходна закрануць адзін важны аспект, які тычыцца мабілізацыйнай функцыі інтэлектуала, паколькі ўсе вышэйназваныя функцыі і характарыстыкі інтэлектуала (прафесійная дзейнасць у сферы разумовай працы; стварэнне новага інтэлектуальнага прадукту, прызначанага для публічнай сферы; выхад за рамкі прафесійнай кампетэнцыі; функцыя крытычнасці; палітычная ангажаванасць; ініцыяванне і стымуляванне публічнай дыскусіі/абмеркавання) у канчатковым выніку датычацца менавіта гэтай функцыі (мабілізацыі). Калі схематызаваць працэс мабілізацыі інтэлектуалам, ён можа выглядаць наступным чынам: мабілізацыя → інфармацыйная мабілізацыя → мабілізацыя дзеяння → групавая альбо масавая мабілізацыя.

Мабілізацыя ўяўляе сабой актывізацыю сродкаў і рэсурсаў для рэалізацыі сацыяльна-палітычных патрабаванняў. Інфармацыйная мабілізацыя ставіць сабе за мэту прыцягненне ўвагі да пэўнай сацыяльнай ці палітычнай праблемы, актуалізацыю праблемнай сітуацыі ў публічнай прасторы з дапамогай шырокага распаўсюджвання інфармацыі і ініцыявання грамадскай дыскусіі. У залежнасці ад характару і маштабу праблемы інфармацыйнай мабілізацыі можа быць дастаткова, бо менавіта прызнанне канкрэтнай праблемы на ўзроўні грамадства вымушае ўлады (або іншага агента) да прыняцця канкрэтных дзеянняў. У тых выпадках, калі праблемная сітуацыя носіць больш сур'ёзны або канфліктны характар, інфармацыйная мабілізацыя становіцца папярэдне неабходным этапам мабілізацыі дзеяння (напрыклад, збор подпісаў, пікеты, забастоўкі і г. д.). У сваю чаргу мабілізацыя можа быць накіравана або на грамадскасць у цэлым, калі гэта пытанне закранае інтарэсы ўсіх або большасці грамадзян, або на асобныя групы (прафесійныя, узроставыя, гендэрныя і інш.). У некаторых выпадках мабілізацыя можа быць накіравана на іншых інтэлектуалаў як сацыяльную групу і лідараў меркаванняў для ўзмацнення мабілізацыйнага эфекту. Мера мабілізацыйнага патэнцыялу інтэлектуала сведчыць аб ступені яго здольнасці стаць ініцыятарам актуалізацыі пэўнай праблемы і рэалізацыі сацыяльна-палітычных патрабаванняў, іншымі словамі, сведчыць аб рэсурсе, якім валодае інтэлектуал [11].

Такім чынам, у сацыяльнай прасторы інтэлектуал з'яўляецца тым сацыяльным агентам, які вырашае або спрабуе вырашыць грамадска значныя праблемы, з якімі іншыя сацыяльныя агенты або інстытуцыі не здольны справіцца, у прыватнасці, з-за адсутнасці дастатковага сімвалічнага капіталу альбо нежадання па пэўных прычынах, напрыклад, звязаных з пытаннямі палітычнага характару (барацьбой за ўладу ці яе рэалізацыяй). Менавіта інтэлектуал, дзякуючы свайму асабліваму сацыяльнаму становішчу, здольны выкрываць і актуалізаваць тыя ці іншыя сацыяльныя праблемы і канфлікты. Менавіта ён, дзякуючы наяўнасці ў яго неабходных рэсурсаў, напрыклад, сімвалічнага капіталу, здольны прэтэндаваць на рашэнне гэтых праблем з дапамогай сацыяльнай мабілізацыі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Баран, П. Ответственность интеллектуала / П. Баран // Научно-просветительский журнал «Скепсис» [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://scepsis.net/library/id_2606.html. – Дата доступа: 14.08.2016.

2. Бауман, З. Законодатели и толкователи. Культура как идеология интеллектуалов / З. Бауман // Неприкосновенный запас [Электронный ресурс]. – 2003. – № 1 (27). – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/nz/2003/1/baum.html. – Дата доступа: 01.09.2016.

3. Бенда, Ж. Предательство интеллектуалов / Ж. Бенда. – М.: ИРИСЭН, 2009. – 312 с.

4. Боббио, Н. Интеллектуалы и власть / Н. Боббио // Библиотека Якова Кротова [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://krotov.info/libr_min/02_b/ob/bio.htm. – Дата доступа: 04.12.2016.

5. Данилов, А. Н. Политическая социология: глубокий кризис или бег с препятствиями? / А. Н. Данилов, Ж. М. Грищенко // Социология. – 2012. – № 1. – С. 3 – 15.

6. Сартр, Ж. Защитительная речь в пользу интеллектуалов / Ж. Сартр // Научно-просветительский журнал «Скепсис» [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://scepsis.net/library/id_2752.htm. – Дата доступа: 14.12.2016.

7. Тощенко, Ж. Т. Интеллигенция и интеллектуалы: современные реалии / Ж. Т. Тощенко // Социология. – 2012. – № 1. – С. 27 – 36.

8. Фуко, М. Интеллектуалы и власть / М. Фуко. – М.: Праксис, 2006. – 320 с.

9. Фуко, М. Политическая функция интеллектуала / М. Фуко // Библиотека Гумер [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://www.gumer. info/bibliotek_Buks/Culture/Fuko_intel_power/Fuko_10.php. – Дата доступа: 13.09.2016.

10. Шарль, К. Интеллектуалы во Франции / К. Шарль. – М.: Новое издательство, 2005. – 328 с.

11. Яницкий, О. Н. Массовая мобилизация: проблемы теории / О. Н. Яницкий // Научно-просветительский журнал «Скепсис» [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://scepsis.net/library/id_12399.htm. – Дата доступа: 19.02.2016.

## References

1. Baran P., “Responsibility of the intellectual”, Available at: http://scepsis.net/library/id_2606.html, (accessed 14.08.2016).

2. Bauman Z., “Legislators and interpreters. Culture as the ideology of intellectuals”, Available at: http://magazines.russ.ru/nz/2003/1/baum.html, (accessed 01.09.2016).

3. Benda Zh., *Predatel’stvo intellektualov* [Treachery of intellectuals], IRISEN, Moscow, RU, 2009.

4. Bobbio N., “Intellectuals and power”, Available at: http://krotov.info/libr_min/02_b/ob/bio.htm, (accessed 04.12.2016).

5. Danilov A. N., Grishchenko Zh. M., “Political sociology: a deep crisis or a hurdle race?”, *Sotsiologiia* [Sociology], 2012, no. 1, pp. 3–15.

6. Sartr Zh., “Protective speech in favor of intellectuals”, Available at: http://scepsis.net/library/id_2752.htm, (accessed 14.12.2016).

7. Toshchenko Zh. T., “Intellectuals and intellectuals: modern realities”, *Sotsiologiia* [Sociology], 2012, no. 1, pp. 27–36.

8. Fuko M., *Intellektualy i vlast’* [Intellectuals and power], Praksis, Moscow, RU, 2006.

9. Fuko M., “The political function of the intellectual”, Available at: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Culture/Fuko_intel_power/Fuko_10.php, (accessed 13.09.2016).

10. Sharl’ K., *Intellektualy vo Frantsii* [Intellectuals in France], Novoe izdatel’stvo, Moscow, RU, 2005.

11. Ianitskii O. N., “Mass mobilization: problems of theory”, Available at: http://scepsis.net/library/id_12399.htm, (accessed 19.02.2016).

## Информация об авторе

**Стаселько Кирилл Игоревич** – аспирант. Институт социологии НАН Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: kirstaselka@gmail.com

## Information about the author

**Kiryl I. Staselko** – Postgraduate Student, Institute of Sociology, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: kirstaselka@gmail.com